Установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава”

На правах рукапісу

УДК 37(476.5)(091)

Н - 259

**Карпекін Канстанцін Рыгоравіч**

# РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАГА АСЯРОДДЗЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ (20-Я – 30-Я ГГ. XX СТ.)

1-08 80 06 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Дысертацыя на суісканне акадэмічнай ступені
магістра педагагічных навук

Навуковы кіраўнік –
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт Зінькова Н. К.

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М.Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Віцебск, 2008

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ....................................................................................3

ГЛАВА 1. КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЕ АСЯРОДДЗЕ ЯК АБ'ЕКТ РЭГІЯНАЛЬНАГА ГІСТОРЫКА-ПЕДАГАГІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ....................................................................................7
1.1. Месца і роля рэгіянальных даследаванняў у гісторыка-педагагічнай навуцы ....................................................................................7
1.2. Сутнасць, кампаненты і спецыфіка савецкага культурна-адукацыйнага асяроддзя 20-х – 30-х гг. XX ст. ....................................................................................13

ГЛАВА 2. КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў КАНТЭКСЦЕ УМОЎ НОВАГА ГРАМАДСКАГА ЛАДУ....................................................................................19
2.1. Адметнасці савецкай мастацкай культуры 20-х – 30-х гг. XX ст. і праяўленне яе феномену на Віцебшчыне....................................................................................19
2.2. Віцебск як цэнтр развіцця выяўленчага і музычнага мастацтва рэгіёна.......27

ГЛАВА 3. АДУКАЦЫЯ Ў ВІЦЕБСКІМ РЭГІЁНЕ: ТРАНСФАРМАЦЫЯ ЗМЕСТУ І ФОРМ НА ПРАЦЯГУ 20-Х – 30-Х ГГ. XX СТ. ...............34
3.1. Адлюстраванне асноўных тэндэнцый развіцця савецкай асветы на Віцебшчыне....................................................................................34
3.2. Уклад педагогаў віцебскага рэгіёна ў тэорыю і практыку выхавання.........42

ЗАКЛЮЧЭННЕ....................................................................................50

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ....................................................................................53

ДАДАТКІ....................................................................................65

# УВОДЗІНЫ

На працягу свайго існавання чалавецтва стварае вакол сябе пэўнае асяроддзе (культурнае асяроддзе – так як яно створана чалавекам), у якім мае жыццёвую неабходнасць і неад'емнай часткай якога яно само становіцца. Дадзенае асяроддзе мусіць задавальняць патрэбы людзей: гэтыя патрэбы маюць разнастайныя праяўленні. Чалавечае грамадства і арганічна звязанае з ім (і створанае ім) асяроддзе змяняюцца, утвараючы новую якасць, праходзячы тым самым гістарычныя этапы свайго развіцця. У розных геаграфічных рэгіёнах, у розныя гістарычныя эпохі згаданыя этапы змяняюць адно аднаго з рознай хуткасцю. Пры гэтым дадзеная хуткасць можа залежаць ад якасці асяроддзя на пэўны момант часу, ад якасці суседніх асяроддзяў, ад інтэнсіўнасці сувязяў паміж рознымі асяроддзямі. Такое культурнае асяроддзе мае ў сваёй структуры мноства складнікаў, кожны з якіх выконвае сваю адмысловую функцыю. Прыкладамі іх могуць служыць мастацка-культурнае і адукацыйнае асяроддзе. Першае канцэнтруе ў сабе найважнейшыя ўсвядомленыя і сістэматызаваныя грамадствам каштоўнасці. З дапамогай жа другога яны мэтанакіравана перадаюцца кожнаму з пакаленняў людзей. Такім чынам, ведаючы асаблівасці мастацка-культурнага асяроддзя, магчыма вызначыць адметныя рысы свядомасці пэўнай супольнасці людзей, іх схільнасці ў адносінах паміж сабой і ў стасунках з прадстаўнікамі іншых супольнасцяў. У сваю чаргу аналіз адукацыйнага асяроддзя дазваляе выявіць той комплекс каштоўнасцяў, які лічыцца найбольш жыццёва неабходным, а таксама спецыфіку яго засваення.

Як зазначалася вышэй, розныя варыяцыі культурна-адукацыйнага асяроддзя маюць адрозныя адно ад аднаго часава-прасторавыя характарыстыкі. Даследаванне асаблівасцяў кожнай з іх мае значэнне не толькі для канкрэтнай чалавечай супольнасці, але і для ўсяго грамадства ў цэлым. Што датычыцца культурна-адукацыйнага асяроддзя Віцебшчыны 1920-х – 1930-х гг., то яно таксама ўяўляе цікавасць для аб'ектыўнага навуковага асэнсавання. Вывучэнне мастацкай культуры і адукацыі, што развіваліся ў канкрэтным рэгіёне, дазваляе выявіць мясцовыя асаблівасці згаданых з'яў, адзначыць адзінкавае, а мноства адзінкавых выпадкаў у сваю чаргу ўтварае агульнае. Адначасова даследаванне краязнаўчых пытанняў з'яўляецца складнікам асэнсавання ўсеагульнай гісторыі.

Адметнасць жа 1920-х – 1930-х гг. у тым, што яны з'яўляюцца першапачатковым этапам існавання на пэўнай тэрыторыі савецкага грамадскага ладу. Асаблівасці яго функцыянавання адбіліся на свядомасці некалькіх пакаленняў людзей, якія нават пасля знікнення згаданай палітычнай сістэмы маглі ажыццяўляць перадачу засвоеных каштоўнасцяў. Апошнія нельга поўнасцю адмаўляць ці прымаць як бездакорны ўзор для пераймання. Аналіз усіх станоўчых і адмоўных асаблівасцяў працэсу развіцця культурна-адукацыйнага асяроддзя Віцебшчыны 1920-х – 1930-х гг. у комплексе з аналізам трансфармавання сусветнага культурна-адукацыйнага асяроддзя можа даць тэарэтычны падмурак для выяўлення крытэрыяў эфектыўнасці далейшага развіцця мастацкай культуры і адукацыі Віцебшчыны.

У сувязі з гэтым даследаванне культурна-адукацыйнага асяроддзя Віцебшчыны стане адмысловым гісторыка-педагагічным даследаваннем пэўнага рэгіёна. Значэнне такога даследавання ў тым, што яно падмацавана канкрэтнымі фактамі, асвятляе ступень адпаведнасці развіцця рэгіёна агульным тэндэнцыям, спрыяе фармаванню патрыятычных пачуццяў.

Як гісторыка-культурны рэгіён Віцебшчына (усходняя частка сучаснай Віцебскай вобласці) з'яўляецца адметнай у плане ўзнікнення тут у пачатку XX ст. і развіцця на працягу 20-х – 30-х гг. XX ст. адмысловай культурна-адукацыйнай прасторы. У азначаны перыяд часу віцебскі рэгіён быў асяроддзем, дзе адбываўся сінтэз традыцый і наватарства з аднаго боку, айчыннага і замежнага – з другога. Пры гэтым усе названыя чатыры элементы з'яўляліся ўзаемапранікальнымі, узаемазвязанымі, у пэўнай ступені абумоўлівалі адно аднаго. Кульмінацыяй развіцця культурна-адукацыйнага асяроддзя рэгіёна стала тое, што ён (а ў асаблівай ступені цэнтр рэгіёна – г. Віцебск) стаў на пэўны час цэнтрам развіцця выяўленчага і музычнага мастацтва рэспублікі. Трывалыя традыцыі, замацаваныя ў свядомасці людзей не толькі шляхам непасрэднага ўспрыняцця твораў мастацтва, але і праз уздзеянне асветных інстытутаў, не маглі не пакінуць след на далейшым развіцці грамадства, функцыянуючага ў межах віцебскага рэгіёна і па-за імі. Такія трывалыя традыцыі не маглі не распаўсюджвацца праз прастору і час. Іх элементы яшчэ доўгі час будуць складнікамі сацыяльнага быцця.

Праблема развіцця культурна-адукацыйнага асяроддзя віцебскага рэгіёна ў 1920-я – 1930-я гг. знайшла сваё адлюстраванне ў шэрагу даследаванняў. У працэсе асэнсавання вылучанай праблемы магчыма азначыць наступныя этапы:

1) 1920-я – 1930-я гг. У дадзены прамежак часу з'явіліся даследаванні І. Гаўрыса, Ул. Прыбыткоўскага, І. Фурмана, М. Касьяровіча і інш. Адметнасць іх у тым, што яны былі спробамі асэнсавання сапраўднай рэчаіснасці, што пазбаўляла даследаванні поўнай аб'ектыўнасці, бо не маючы ўяўлення пра наступствы пэўнай з'явы, немагчыма ацаніць яе значэнне для гістарычнага працэсу;

2) 1940-я – 1980-я гг. Вылучаны перыяд адметны малалікасцю спецыяльных вышукаў, прысвечаных даследуемай праблеме. Паводле іх можна меркаваць пра агульны стан развіцця мастацкай культуры і адукацыі на савецкіх тэрыторыях.У цэлым адметнасці развіцця Віцебшчыны разглядаліся тут у самым абагуленым аспекце. Да такіх даследаванняў варта аднесці працы па гісторыі культуры П. Карнача, У. Няфёда і па гісторыі адукацыі Ф. Каралёва, М. Кузіна, С. Штамма, а таксама шэраг калектыўных прац;

3) 1990-я гг. – пачатак XXI ст. На працягу дадзенага этапу адбылася значная інтэнсіфікацыя вывучэння розных аспектаў праблемы развіцця культурна-адукацыйнага асяроддзя Віцебшчыны 1920-х – 1930-х гг. Гэта праявілася ў наступных з'явах. Па-першае, у абмеркаванні пытанняў згаданай тэматыкі пад час навуковых канферэнцый рознага кшталту (пра гэта сведчаць публікацыі Г. Бебрынай, М. Галасковай, М. Гугніна, А. Лісава, Ю. Маханькова, Н. Мацаберыдзе, А. Русецкага, Г. Смоліна і інш.). Па-другое, у падрыхтоўцы адмысловых зборнікаў дакументаў (пэўныя з іх падрыхтаваны Л. Налівайка,

супрацоўнікамі Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці). Па-трэцяе, у абароне дысертацый па згаданай тэматыцы (М. Дзмітрыеў, М. Куракевіч, Г. Хацешава і інш). Па-чацвертае, у з'яўленні артыкулаў краязнаўчага характару ў перыядычным друку. Аўтарамі гэтых артыкулаў з'яўляюцца М. Белякова, А. Бондарава, І. Клімковіч, М. Крупіца, А. Падліпскі і інш.

Аб'ектам дадзенага даследавання выступае ўсё мноства праяўленняў культурна-адукацыйнага жыцця Віцебшчыны ў кантэксце агульнасавецкіх з'яў на працягу 1920-х – 1930-х гг.

Прадметам даследавання з'яўляецца механізм узаемадзеяння мастацка-культурнага і адукацыйнага асяроддзяў Віцебшчыны.

Мэта даследавання заключаецца ў спробе аналізу асаблівасцяў працэсу развіцця культурна-адукацыйнага асяроддзя віцебскага рэгіёна на працягу 1920-х – 1930-х гг.

Мэта дасягалася з дапамогай вырашэння наступных задач:

1) выявіць сутнасць, кампаненты і спецыфіку савецкага культурна-адукацыйнага асяроддзя;

2) прасачыць праяўленне феномену савецкай мастацкай культуры 20-х – 30-х гг. XX ст. на Віцебшчыне;

3) вызначыць значэнне горада Віцебска як цэнтра развіцця выяўленчага і музычнага мастацтва пэўнага рэгіёна;

4) акрэсліць асноўныя тэндэнцыі ў сферы асветы ва ўмовах існавання савецкага палітычнага ладу і іх праяўленне ў межах віцебскага рэгіёна;

5) прааналізаваць уклад педагогаў Віцебшчыны ў тэорыю і практыку выхавання.

У аснову даследавання леглі такія метадалагічныя прынцыпы, як прынцып гістарызму, прынцып сістэмнасці, прынцып еднасці гістарычнага і лагічнага .

Пад час даследавання найбольш актыўна выкарыстоўваліся метады бібліятэчнай і архіўнай эўрыстыкі, з дапамогай якіх быў выяўлены канкрэтны факталагічны і тэарэтычны матэрыял для далейшага аналізу; метад абагульнення, на падставе якога вызначаліся характэрныя рысы даследуемых з'яў і працэсаў; метад тыпалагізацыі, з дапамогай якога акрэсліваліся тыпы такіх сацыяльных інстытутаў, як навучальныя ўстановы; а таксама метады аналізу і сінтэзу, індуктыўны і дэдуктыўны метады, прымяненне якіх спрыяла больш грунтоўнаму асэнсаванню неабходнай інфармацыі.

Практычная значнасць даследавання заключаецца ў тым, што яно, па-першае, дазваляе пазбегнуць разнастайных хібаў, якія мелі месца як у тэарэтычнай распрацоўцы, так і ў практычным ажыццяўленні прынцыпаў развіцця мастацкай культуры і адукацыі Віцебшчыны 20-х – 30-х гг. XX ст.; па-другое, прадстаўляе станоўчы вопыт для пераемнасці ў развіцці сучаснай культурнай сферы жыцця грамадства віцебскага рэгіёна.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў якасці матэрыялу для пэўных навучальных курсаў у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, а таксама ў пазашкольнай працы: па гісторыі развіцця мастацкай культуры,

сістэмы адукацыі, педагагічнай думкі. Таксама даследаванне мае пэўную краязнаўчую вартасць.

Навуковая навізна даследавання бачыцца ў тым, што была ажыццёўлена спроба даць комплекснае азначэнне тэрміну "культурна-адукацыйнае асяроддзе"; пад час даследавання мастацкая культура і адукацыйная прастора савецкіх абшараў і Віцебшчыны 20-х – 30-х гг. ХХ ст. разглядаліся ў глыбокай узаемасувязі; у навуковы зварот быў уведзены шэраг дакументаў з фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

Гіпотэза даследавання: на працягу 1920-х – 1930-х гг. На тэрыторыі Віцебшчыны развівалася цэласнае культурна-адукацыйнае асяроддзе, якое актыўна засвойвала здабыткі сусветнага культурна-адукацыйнага асяроддзя, адначасова дапаўняючы і ўзбагачаючы яго.

Асноўнымі палажэннямі магістэрскай дысертацыі, якія выносяцца на абарону, з'яўляюцца наступныя:

1) мастацкая культура савецкіх тэрыторый 20-х – 30-х гг. ХХ ст. фармавалася ва ўмовах станаўлення якасна новага грамадскага ладу, што абумовіла яе асноўныя характарыстыкі: партыйнасць, агітацыйнасць, народнасць, першапачатковы плюралізм думкі. Вылучаныя характэрныя рысы мастацкай культуры савецкіх рэспублік даследуемага прамежку часу ў цэлым былі ўласцівы і для аналагічнай з'явы, што мела месца на Віцебшчыне;

2) 20-я – 30-я гг. ХХ ст. – гэта час, калі Віцебск з'яўляўся цэнтрам развіцця выяўленчага і музычнага мастацтва рэгіёна, што было выклікана аб'ектыўнымі прычынамі. Гэта праявілася ў з'яўленні і функцыянаванні "віцебскай мастацкай школы" і ў станаўленні Віцебска як месца гастроляў савецкіх і замежных артыстаў;

3) на працягу 1920-х – 1930-х гг. адбываўся працэс фармавання адмысловай савецкай сістэмы адукацыі. Ён праявіўся ў распрацоўцы савецкімі грамадска-палітычнымі дзеячамі і педагогамі асноў зместавых характарыстык навучання і выхавання, у стварэнні сеткі разнастайных навучальных устаноў, разгалінаванай сістэмы інстытутаў кіранвання гэтымі ўстановамі;

4) значны ўклад у педагагічную тэорыю і практыку быў унесены асобамі, чыя дзейнасць была звязана з Віцебшчынай. Найбольш яскрава гэта праявілася ў сферы вышэйшай адукацыі: у яе непасрэдна педагагічным, мастацкім і музычным накірунках. Дасягненні ў азначаных сферах былі зроблены М. Ціхаміравым, М. Бахціным, Ю. Пэнам, М. Шагалам, К. Малевічам, І. Салярцінскім, А. Малько і інш.

Асноўныя вынікі даследавання знайшлі сваё адлюстраванне ў шэрагу артыкулаў, змешчаных у зборніках навуковых прац.

Дысертацыя складаецца з уводзін, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадатку. Спіс выкарыстаных крыніц складаецца са 189 найменняў.